# РУСКА-БЕЛАРУСКІ РАЗМОЎНІК ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

Сёння беларускую мову ў нашым універсітэце, на жаль, пачуеш нячаста. Хіба толькі выкладчыкі ды студэнты, якія навучаюцца па спецыяльнасці «Беларуская філалогія», выкарыстоўваюць яе ў паўсядзённым жыцці.

З мэтай папулярызацыі роднай мовы супрацоўнікі аддзела студэнцкай творчасці і культурна-забаўляльнай дзейнасці штогод стараюцца да Міжнароднага дня роднай мовы падрыхтаваць цікавае і пазнавальнае мерапрыемства. Сёлета, напрыклад, вырашылі скласці руска-беларускі размоўнік і раздаць яго ўсім ахвотным у фае галоўнага корпуса. Для гэтага яны ўзялі найбольш распаўсюджаныя сярод студэнтаў выразы, кшталту «дазвольце ўвайсці», «прабачце, я спазніўся» і інш.




Размоўнікам зацікавіліся не толькі беларускія, але і туркменскія хлопцы і дзяўчаты, якія з задавальненнем стараліся вымавіць беларускія словы і абяцалі карыстацца імі ў паўсядзённым жыцці.

**На здымку:** студэнты знаёмяцца з руска-беларускім размоўнікам.

**Фота В. ЛУЗГІНОЙ.**